# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі
Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны
«КАТЭГОРЫІ ПРАСПЕКЦЫІ І РЭТРАСПЕКЦЫІ
Ў МАСТАЦКАЙ ПРОЗЕ У. ГНІЛАМЁДАВА»,
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Інтарэс даследчыкаў да вывучэння мовы мастацкага твора, сродкаў і спосабаў рэпрэзентацыі тэкставых катэгорый у беларускім мовазнаўчым асяроддзі заканамерны і відавочны. Перамены аб'ектыўнага характару, звязаныя з развіццем сучаснай лінгвістыкі тэксту, патрабуюць распрацоўкі метадалагічных параметраў для ўпарадкавання мастацкіх катэгорый і сістэматызацыі іх моўнай рэпрэзентацыі.

Лічым, што навуковай навізной дысертацыі Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны «Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова, з'яўляецца шэраг вылучаных даследчыкам палажэнняў, аргументавана абгрунтаваных у тэксце аўтарэферата: выяўленне рэпрэзентатыўнага корпуса катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе з вылучэннем рознаўзроўневых адзінак; вызначэнне тыпаў і відаў праспекцыі і рэтраспекцыі ў раманах У. Гніламёдава; сістэматызацыя сродкаў моўнага выражэння праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор з улікам набора параметраў іх упарадкавання; вызначэнне структурнай арганізацыі праспектыўных і рэтраспектыўных частак.

Трэба адзначыць практыкаарыентаванасць вынікаў даследавання. Распрацаваныя Дзігадзюк Валянцінай Паўлаўнай крытэрыі аналізу, прынцыпы класіфікацыі тэкставых катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні іншых тэкстаструктур мастацкай прозы. Спадзяемся, гэта будзе ўвасоблена саіскальнікам і ў актах укаранення.

У аўтарэфераце прыведзены пераканаўчыя дадзеныя даследавання фактычнага матэрыялу, картатэка якога складае 1463 адзінкі і змяшчаецца ў шматлікіх дадатках дысертацыі. Між тым, у аўтарэфераце адзначана “колькасць крыніц фактычнага матэрыялу даследавання – 7” (с. 3). Хацелася б удакладніць, чым абумоўлена гэтая выбарка? Якія крытэрыі былі выкарыстаны саіскальнікам для адбору крыніц?

Пераканаўчасць высноў навуковага даследавання падмацоўваюць візуальныя элементы інфаграфікі з дэталізацыяй структуры кампазіцыйна-тэкставай праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава. Распрацаваныя дысертанткай практычныя рэкамендацыі неабходны ў далейшым вывучэнні катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў розных тыпах тэкстаў і жанрах мастацкай літаратуры, а таксама пры вывучэнні праблем дыферэнцыяцыі і інтэрпрэтацыі катэгорый мастацкага тэксту.

Зыходзячы з аналізу аўтарэферата, адзначым, што дысертацыя Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны характарызуецца выразнай структурай. Аўтарскія аргументы і вывады падмацаваны вывучэннем шматлікіх тэарэтычных (198 крыніц). Саіскальнік мае дастатковую колькасць навуковых публікацый па тэме даследавання (14 пазіцый).

Дысертацыя Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны «Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава» з'яўляецца самастойным і завершаным навуковым даследаваннем, якое адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да кандыдацкіх дысертацый. Яе аўтар – Дзігадзюк Валянціна Паўлаўна – заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Загадчык кафедры перыядычнага друку
і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ,
доктар філалагічных навук,
дацэнт С.В. Харытонава

ПОДПИСЬ Харытонава СВ УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник управления
организационной работы и
документационного обеспечения
Н.Б. Черкасская
15 09 2023